"Поўныя Духа і пасланыя"

Аўтар: Кінга Красіцкая
21.10.2018 00:00



Пад такім дэвізам 21 кастрычніка ў Касцёле распачынаецца Місійны тыдзень. Праз свае малітвы і матэрыяльныя ахвяры каталікі пакліканы падтрымаць маладыя і бедныя Касцёлы на місійных тэрыторыях. Гэта таксама час выказвання ўдзячнасці за дар веры і асаблівай памяці аб місіянерах, якіх ва ўсім свеце сёння налічваецца каля 350-ці тысяч. Яны цяжка працуюць, без агалоскі, становячыся сведкамі і веснікамі Добрай Навіны ўсюды, куды іх паслаў Бог. Перадаваць веру да канцоў зямлі

У “місійны час” нас уводзіць Пасланне папы Францішка на Сусветны дзень місій, якое ў гэтым годзе асаблівым чынам скіравана моладзі. У ім Святы Айцец звяртае ўвагу на тое, што кастрычнік з’яўляецца чарговай нагодай, каб стаць вучнямі-місіянерамі, якія ўсё больш любяць Езуса і Яго місіі, ажно да самых далёкіх канцоў зямлі. † “Вы, маладыя людзі, праз хрост сталі жывымі членамі Касцёла, і мы разам закліканы несці Евангелле ўсім. Вы ўваходзіце ў жыццё. Узрастанне ў ласцы веры, перадаваемай праз сакраманты Касцёла, уключае нас у паток пакаленняў сведкаў, дзе мудрасць тых, хто мае досвед, становіцца сведчаннем і матывацыяй для тых, хто адкрываецца на будучыню.

А навізна маладых становіцца, у сваю чаргу, падтрымкай і надзеяй для асоб, якія набліжаюцца да мэты свайго падарожжа. Дзякуючы суіснаванню розных узроставых груп Касцёл у сваёй місіі будуе масты паміж пакаленнямі, праз якія вера ў Бога і любоў да бліжняга становяцца фактарамі глыбокай еднасці”, – напісаў Папа.

Святы Айцец падкрэсліў, што перадача веры – сутнасць місіі Касцёла – адбываецца праз “заражэнне” любоўю, дзякуючы чаму радасць і энтузіязм выражаюць нанова знойдзены сэнс і паўнату жыцця: “Распаўсюджанне веры шляхам прыцягнення патрабуе адкрытых, расшыраных любоўю сэрцаў. А такая адкрытасць нараджае сустрэчу, сведчанне, абвяшчэнне; нараджае ўзаемнае дзяленне ў любові з тымі, хто далёкі ад веры, абыякавы да яе, а часам бывае непрыхільны ці супрацівіцца ёй. Людскія асяроддзі, культурныя і рэлігійныя, якія ўсё яшчэ не ведаюць Евангелля Езуса і сакраментальнай прысутнасці Касцёла, з’яўляюцца самымі далёкімі «канцамі зямлі», куды з часоў Пасхі Езуса пасланы Яго вучні і місіянеры, з упэўненасцю, што побач з імі заўсёды знаходзіцца Пан (параўн.: Мц 22, 20; Дз 1, 8). На гэтым і засноўваецца тое, што мы называем «missio ad gentes» («місіі да народаў»)”.

Аўтар: Кінга Красіцкая
21.10.2018 00:00

Місіі – справа не толькі духавенства



Місіянер – гэта, найперш, чалавек добрай волі, які ахвяруе тое, што мае каштоўнага, г. зн. самога сябе, дар свайго жыцця бліжняму і Касцёлу. Прагненне стаць місіянерам – хто абвяшчае ўваскрослага Хрыста жыццём і словам – напрамую вынікае з веры, з усведамлення таго, што Езус з'яўляецца найкаштоўнейшым скарбам, з радасці, што ім валодаеш, а таксама з жадання адорваць іншых тым, што сам атрымаў бясплатна і што так жа бясплатна можа атрымаць кожны. Асобамі, якія вырушаюць на місіі, звычайна кіруе ўнутраны голас, які гаворыць: "Я атрымаў многае, і цяпер хацеў бы гэтым падзяліцца".

Кожны веруючы павінен адчуваць сябе адказным за Касцёл, які ствараюць як кансэкраваныя, так і свецкія асобы, і разумець, што місійная паслуга пачынаецца з давання сведчання ў сям'і і на месцы працы, з удзелу ў жыцці парафіяльных супольнасцей. Быць місіянерам – гэта таксама значыць рэалізаваць запаведзі любові да бліжняга. Што большага мы здольны ахвяраваць іншаму, чым усведамленне Божай любові, чым дарога да адкрыцця каштоўнасці і годнасці ўласнай чалавечнасці, што ўспрымаецца ў святле Хрыста, які стаў Чалавекам, каб аддаць жыццё за ўсіх людзей?

У Ватыкане склалі спіс прозвішчаў загінуўшых за веру місіянераў і місіянерак. Згодна з гэт

"Поўныя Духа і пасланыя"

Аўтар: Кінга Красіцкая
21.10.2018 00:00



